Максім Гацак

# Радавод Гацакоў і Гацукоў, сялянаў Бабруйскага павету

МІНСК 2011

## Змест

Уводзіны……………………………………………………………………3
1. Гацакі (вёска Лейчыцы, цяпер Бабруйскі раён)………………………5
1.1. Гісторыя прозвішча…………………………………………………..5
1.2. Гісторыя роду…………………………………………………………9
1.3. Радавод………………………………………………………………12
1.4. Лейчыцы……………………………………………………………...27
2. Гацакі (вёска Дваранінавічы, цяпер Кіраўскі раён)……………………29
2.1. Гісторыя роду……………………………………………………..….29
2.2. Радавод……………………………………………………...…………29
2.3. Дваранінавічы………………………………………...……….....31
3. Гацукі (вёска Атрошкавічы, цяпер Бабруйскі раён)…………….……..33
3.1. Гісторыя роду…………………………………………………………33
3.2. Радавод ………………………………………………………….……34
3.3. Атрошкавічы……………………………………………………….…41
Высновы………………………………………………………………………42
Крыніцы і літаратура…………………………………………………………43

## Уводзіны

У апошні час у свеце ў цэлым і ў Беларусі ў прыватнасці назіраецца пэўны ўсплёск зацікаўленасці людзей уласнымі радаводамі альбо радаводамі вядомых дзеячоў, родаў і гэтак далей. Даследванне дадзенага пытання ўяўляе вялікую цікавасць, паколькі, па-першае, дапамагае людзям разабрацца ў сваім паходжанні і каранях, па-другое, разглядаючы асабістыя гісторыі пэўных родаў ці людзей, дапамагае лепш зразумець паводзіны людзей у розныя перыяды гісторыі, іх матывацыі, прыватнаё жыццё і гэтак далей.

Дадзеная праца ўяўляе сабой спробу апісанне гісторыі дзвюх сялянскіх сем’яў Бабруйскага павету – Гацакоў і Гацукоў, якія, магчыма, з’яўляліся адгалінаваньнямі ад аднаго роду. Мэтай працы ёсць вывучэнне пазначаных родаў, задачамі – стварэнне іх радаводнага роспісу, даследванне гісторыі як родаў у цэлым, так і іх прадстаўнікоў у прыватнасці, аналіз этымалогіі паходжання прозвішча, узаемасувязі родаў паміж сабой.

Актуальнасць і навізна работы палягае ў малой даследаванасці сялянскіх радаводаў у беларускай навуцы і гісторыі родаў, якія пражывалі на тэрыторыі былога Бабруйскага павету Мінскай губерні. У працы выкарыстоўваецца комплексны падыход да разгляду акрэсленых тэмай даследавання пытанняў. Асноўнымі сярод выкарыстаных агульнанавуковых метадаў і прыёмаў з’яўляюцца: параўнальны, супастаўляльны, апісальны, аналітычны.

Практычная вартасць работы заключаецца ў магчымасці скарыстання фактычнага матэрыялу і зробленых вынікаў пры даследванні радаводаў іншых беларускіх сялянскіх сем’яў.

Структура работы вызначаецца мэтай і задачамі даследавання і складаецца з уводзінаў, трох раздзелаў з падраздзеламі, заключэння, спіса крыніцаў і выкарыстанай літаратуры. Першы раздзел прысвечаны роду Гацакоў з вёскі Лейчыцы, другі - Гацакоў з вёскі Дваранінавічы, трэці – Гацукоў з вёскі Атрошкавічы. У Заключэнні фармулююцца асноўныя

высновы, атрыманыя ў выніку праведзенага даследавання. Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры ўтрымлівае 28 пазіцый.

Пры напісанні дадзенай працы былі метрычныя кнігі Гарбацэвіцкай, Дваранінавіцкай, Міхалёўскай і Паўлавіцкай цэркваў Бабруйскага павету, успаміны, адмысловая літаратура як айчынных, і замежных аўтараў, дадзеныя з Internet-рэсурсаў для тэарэтычнага абгрунтавання сутнасці доследнай з’явы, яе формаў, кірункаў, фактараў і да т.п. Таксама ў працы прыведзеныя звесткі з гісторыі вёсак, якія былі родавымі гнёздамі даследаваных родаў.

## 1. Гацакі (вёска Лейчыцы, цяпер Бабруйскі раён)

### 1.1. Гісторыя прозвішча

Прадстаўнікі роду Гацак на землях Бабруйшчыны жывуць ужо прынамсі два стагоддзі. Першым яго вядомым прадстаўніком быў Захар (каля 1780-?), які ў першай палове XIX ст. пражываў у вёсцы Лейчыцы Бабруйскага павету Менскай губерні Расійскай імперыі (цяпер вёска Бортніцкага сельсавету Бабруйскага раёну), якая і стала родавым гняздом.

Паводле метрычных запісаў, да 1880-х гадоў найбольш распаўсюджаным варыянтам напісання прозвішча быў Гацук (*Гацукъ*), які пазней быў заменены на Гацак (*Гацакъ, Гоцакъ*). На дадзены момант застаецца нявысветленым, які з двух варыянтаў быў першасным. Верагодна, што прозвішча Гацак было замененае святарамі, якія вялі метрычныя кнігі, на Гацук як найбольш звыклы для іх варыянт гучання. У той самы час Гацук магло змяніцца на Гацак пад уплывам беларускага акання. Але дадзенае пытанне патрабуе больш грунтоўнага даследвання.

У сувязі з вышэй названым узнікае пытанне роднасці Гацакоў-Гацукоў з сям'ёй Гацукоў-Лаўрынёнкаў (*Гацукъ, Гацукъ-Лавриненокъ, Лавриненокъ-Гацукъ, Гатцукъ, Лавриненокъ*), першы вядомы прадстаўнік якіх Сымон Гацук (каля 1820-?) жыў у вёсцы Атрошкавічы Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павету (цяпер Гарбацэвіцкі сельсавет Бабруйскага раёну). Прынамсі, атрошкавіцкія Гацукі былі знаёмыя з лейчыцкімі. Доказам гэтага ёсць факт шлюбу ў 1895 годзе жыхара Атрошкавіч Аляксея Іванавіча Гацука (унука Сымона Гацука) з Макрынай Данілаўнай Пуцік з Хімоў[1]. Яе бацька Даніла Раманавіч Пуцік за некалькі гадоў да таго ажаніўся другім шлюбам з роднай сястрой жонкі Ульяна Мікалаевіча Гацука з Лейчыцаў

---

[1] Мэтрычная кніга Паўлавіцкай царквы Бабруйскага павету // Нацыянальныя гістарычны архіў Беларусі. Фонд 136, вопіс 20, справа 30.

(праўнука Захара Гацука)[2]. Магчыма, што Аляксей і Уллян падтрымлівалі шчыльныя кантакты між сабой, інакш цяжка патлумачыць прычыну пошуку жонкі Аляксеем за 30 кіламетраў ад дому. Адлегласць жа паміж Хімамі і Лейчыцамі складае ўсяго каля 6 кіламетраў. Да таго ж прадстаўнікі абодвух родаў - Уллян Мікалаевіч Гацак[3] з братам Міхалам[4], і сын Аляксея Іван[5] - займаліся садоўніцтвам.

Пра тое, што Гацакі былі немясцовага паходжання сведчыць адносна малая колькасць прадстаўнікоў роду, якія вельмі добра ўпісваюцца ў адзінае генеалагічнае дрэва. Між тым у суседняй з Лейчыцамі вёсцы Дваранінавічы (цяпер Кіраўскі раён) занатаваныя Гацакі, якія ніяк не стасуюцца з агульным радаводам і першым вядомым прадстаўніком якіх быў Павел Гацак (каля 1790-?), магчыма, брат Захара.

У выпадку, калі першапачатковым варыянтам прозвішча сям'і быў менавіта Гацук, невядома, ці мае яна якое-небудзь дачыненне да казацкага-шляхецкага роду Гатцук (Гацук[6]) гербу Пелікан, прадстаўнікі якога пражывалі ў Чарнігаўскай губерні (цяпер Украіна) ды былі зацверджаныя ў шляхецтве ў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі[7]. Цікава, што прадстаўнік гэтага роду - ўкраінскі мовазнаўца і фалькларыст XIX ст. Мыкола Гатцук пісаў сваё прозвішча як Гаццук[8].

Увогуле на дадзены момант вядомыя два абшары, на якіх ў XIX ст. пражывалі Гацукі - заходні (Брэсцкая вобласць і паўднёвая частка Гродзенскай вобласці Беларусі, Жытомірская вобласць Украіны і Падляшскае ваяводства Польшчы) і ўсходні (Чарнігаўская і Сумская вобласці

---

[2] Жонкай Данілы Пуціка была Ганна Карпаўна (1870-1950), жонкай Улляна Гацака – Параскевія Карпаўна (1867-1956). Паводле ўспамінаў сваякоў, яны абедзве з'яўляюцца продкамі аўтара дадзенага даследвання.
[3] Успаміны Уладзіміра Мяфодзевіча Гацака.
[4] Архивная справка по материалам архивного уголовного дела № П-84276 в отношении Гоцак (Гацак) Михаила Николаевича // Управление ФСБ России по Хабаровскому краю
[5] Александр Казак. Последние выстрелы отца // Бабруйскае жыццё, 21.04.2010 (№17180)
[6] Гацук Стефан Якович // Кривошея В.В., Кривошея І.І., Кривошея О.В. Неурядова старшина Гетьманщини. – Київ: "Стилос", 2009 – с. 80
[7] В.К. Лукомскій, В.Л. Модзалевскій, Г.И. Нарбутъ. Малороссійскій гербовникъ. Репринт издания 1914 г., 1993 год
[8] Микола Гаццук. Украі'нс'ка абетка. – Москва, 1860.

Украіны, Бранская вобласць Расіі). Адлегласць паміж гэтымі рэгіёнамі і Бабруйшчынай прыкладна аднолькавая. Гацакі (*Гоцакі*) у ХХ ст. пражывалі пераважна ў заходняй Украіне (Камянец-Падольская й Вінніцкая вобласці), Гацакі – усходняй (Запарожская вобласць)[9].

У любым выпадку, прозвішчы Гацак і Гацук хутчэй за ўсё маюць аднолькавае этымалагічнае тлумачэнне. Паводле Уладзіміра Юрэвіча, яны ўтварыліся ад дзеяслова *гацаць*, г.зн. ехаць шпарка вярхом на кані або хутка ісці, ледзь не бегчы[10]. Аднак у такім выпадку, прозвішча, хутчэй за ўсё, гучала б Гацун (па аналогіі: стрыгчы – Стрыгун, бегчы – Бягун, шмограць – Шмаргун, гойсаць - Гайшун і інш.).

Таксама Гацаком або Гацуком маглі называць чалавека, які будаваў гаць (земляны насып праз балоцістае месца), альбо жыў каля яе[11]. Але, як падаецца, такая версія больш пасуе для тлумачэння паходжання назвы вёскі Гацук у Слуцкім раёне.

Існуе між іншым і версія адыгейскага паходжання прозвішчаў. Паводле яе Гацук (Гатцук) ёсць вытворным ад Хачэцук (Хьак1эц1ык1у, “маленькі госць”, дзе хьак1э можна пачуць як хачэ, хатчэ, гатчэ і г.д.) ці ад Хацук - хьац1ык1у “маленькі сабачка”; а Гацак – ад Хачак (Хьак1акъу, “той, хто ходзіць у госці”)[12]. У прыватнасці, у XIX ст. у расійская арміі на Каўказе служыў паручнік (харужы) Гацук Татаюк[13][14].

Паводле іншай версіі, дадзеныя прозвішчы ўтварыліся ў XVI-XVII стст. У той час пад уплывам польскай моўнай традыцыі зацвердзіліся скарочаныя формы асабістых імёнаў з асновай на -ц, ад якой пазней з дапамогай розных суфіксаў (-ко, -іч, -ур, -енк, -ук, -ак) і ўтварыліся

[9] obd-memorial.ru
[10] Гац, Гацько, Гацкевіч, Гацко, Гацук // Уладзімір Юрэвіч. Беларускія прозвішчы. http://knihi.com/jurevic_u/prozviscy.html
[11] Версія прадстаўленыя генеалогам Вадзімам Урублеўскім.
[12] Адыги - основатели Запорожского казачества? // http://adyga.org/index.php?s=8e6c407fc153d65d196d55085767de39&showtopic=873&pid=20806&st=0&#entry20806
[13] Горские офицеры и полные георгиевские кавалеры Кубанского казачьего войска и территории Кубанской области на службе России (конец XVIII – начало XX в.) // http://slavakubani.ru/read.php?id=499&page=16
[14] Волнения адыгов-казаков Черноморского войска в 1844—1846 гг. // http://budetinteresno.narod.ru/kraeved/adig_history_16.htm

прозвішчы (Гацко, Гацкевіч, Гацура, Гацэнка і іншыя). Прыкладам такіх асноваў ад іншых імёнаў ёсць: селянін Уладзімірскага староства Грыц Антонік (1620), селянін-чацвяртнік Стэц Бяроза (1645), селянін Галіцкага староства Яц Грыцык (1642), сакалоўскі мешчанін Луц (1647). Імя Гац (Гацка), ад якога, верагодна, пайшлі прозвішчы, утварылася ад імёнаў, што пачынаюцца з га-: Гаўрыла, Галактыён, Гапон, Гардзей, Гарасім[15]. Найбольш верагодным з іх падаецца імя Гаўрыла. Дадзеная імянная форма (імя Гацка) зафіксаваная, між іншым, у Рэестры Запарожскага войска 1649 году: казакі Палкавой сотні Чарнігаўскага палка Гацка Мануйленка ды Гацка Чарчыненка, а таксама казак сотні Маркава Чаркаскага палка Ананька Гацка Байрак. У тым самым Чаркаскім палку, але ўжо ў сотні Лазарава служыў казак Мацвей Гацучэнка, г.зн. сын Гацука[16].

Апроч таго, імя Гацка (Hacko) зафіксаванае ў інвентары Бабруйскага староства Рэчыцкага павету Менскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага за 1639 год. Так, там узгадваюцца жыхары Бабруйска - Гацка Труханoвіч, Гацка Пляскун, Гацка Чачалевіч, Гацка Выпановіч, Гацка Цяненіч Касінскі, Гацка Пляскач Хоніч, Гацка Зеляцевіч, Гацка Янцэвіч і іншыя[17].

Цікава, што па-ўкраінску “гацак” (гоцак) – другая назва трапака – украінскага народнага танцу блізкага да гапаку[18]. А паводле легенды “Беларускі радавод”, створанай у 1913 годзе беларускім гісторыкам і публіцыстам Вацлавам Ластоўскім, Гацук быў старэйшым сынам продка ўсіх беларусаў Бойкі ад кіеўскай князёўны Вольгі, і такім чынам сам з’яўляецца прабацькам значнай часткі беларусаў.

---

[15] Представители фамилии Гацура http://baza.vgd.ru/1/9594/
[16] Реестр Войска Запорожского 1649 года // http://forum.vgd.ru/299/25273/0.htm?a=stdforum_view&o=
[17] Инвентарь Бобруйскага староства // Акты, издаваемые Виленсою коммиссiею для разбора древнихъ актовъ. Том XXV. Инветари и разграничительные акты. – Вильна, 1898 – стр. 114-330
[18] http://www.slovnyk.net/index.php?swrd=%D0%93%D0%9E%D0%A6%D0%90%D0%9A

### 1.2. Гісторыя роду

Як адзначалася, узгаданы намі Захар Гацу(а)к (каля 1780-?), быў першым высветленым прадстаўніком роду ў вёсцы Лейчыцы. Наколькі вядома, ён і яго нашчадкі займаліся сельскай гаспадаркай, былі прыгоннымі сялянамі маёнтку Рыння роды Прушыноўскіх. Захар валодаў даволі вялікім зямельным надзелам агульнай плошчай 27 дзесяцін 290 сажняў (29,63 гектары). Такі надзел, верагодна, быў атрыманы на сям’ю з трох-чатырох мужчынаў пасьля адмены прыгоньніцтва ў 1861 годзе. Пасля смерці Захара зямля была падзеленая паміж яго двума сынамі – Васілём і Міхалам. Затым яе падзялілі сыны апошніх – Мікола з Іванам і Якім. Пры гэтым Якім Міхалавіч атрымаў палову родавага надзелу, а Мікола Васілевіч толькі адну дзесяціну (1,09 гектару). Да таго ж бяздзетны Якім вырашыў перадаць сваю частку родавых земляў селяніну Сымону Арэшку, які працаваў на яго. У выніку 1884-1886 гадах Мікола Гацак быў вымушаны судзіцца спачатку з стрыечным братам, пасля – з Арэшкамі, аднак змог дамагчыся атрымання толькі чвэрці родавай зямлі, у той час як землі Якіма адышлі да Сымона Арэшкі.

У 1896-1897 гадах ён разам з пляменнікам Міхалам Іванавічам Гацаком паўторна судзіўся з Паўлам Сымонавічам і Уллянай Лук'янаўнай Арэшкамі супраць незаконнай перадачы ім паловы родавых земляў Гацакоў. Мікола Гацак сцвярджаў, што ўва ўмовах адсутнасці ў Якіма дзяцей ён і яго пляменнікі з’яўляліся адзінымі законнымі спадчыннікамі маёмасці Якіма, што Сымон Арэшка быў не сваяком, а прымаком-здольнікам у Якіма і атрымліваў за гэта грошы, што тастамент Якіма ад 8 снежня 1884 году на зямлю быў прызнаны ў неадпаведнасці заканадаўству. Таксама звяртаў увагу на прадузятасць суддзі ў 1884 годзе і на тое, што той не даваў яму выступаць у судзе і не выслухаў сведкаў. Тым не менш рашэнне суду ад 1884 году засталося нязменным.

Такім чынам, родавыя землі Гацакоў ў XIX ст. былі аддадзеныя іншым, а таксама пачалі дзяліцца паміж прадстаўнікамі сям'і, што прывяло да фінансава-гаспадарчага збяднення Гацакоў на пачатку XX ст. Паспрыялі збядненню і даўгія судовыя разбіральніцтвы за зямлю, паколькі разгляд справы адбываўся не толькі на мясцовым узроўні, але і ў міністэрстве ўнутраных справаў у Санкт-Пецярбургу.

У апошняй чвэрці найбольш аўтарытэтным членам сям'і быў узгаданы Мікола Гацак (1839 ці 1843-1903). Даслужыўшыся ў войску да звання старшага унтэр-афіцэра і будучы пісьменным, што на той час было даволі рэдкай з'явай, ён кіраваў усімі судовымі разбіральніцтвамі, падпісваючыся за сябе і за сваіх непісьменных сваякоў.

Двое ягоных сыноў – Антон (1873-?) і Міхал (1881-?) – таксама служылі ў войску. Прычым апошні быў удзельнікам расійска-японскай вайны 1904-1905 гадоў, абараняў Порт-Артур, патрапіў у палон. З'ехаўшы з Беларусі, ён працаваў на чыгунцы ў Сібіры. У 1932 годзе Міхал стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсіяў за антысавецкую прапаганду, але праз недаказанасць быў вызвалены[19].

Вельмі цяжкімі для роду былі часы Другой сусветнай вайны. Спачатку яго прадстаўнікі, як Мяхед[20] Уллянавіч Гацак (1903-1979), удзельнічалі ў нападзе СССР на Польшчу 17 верасня 1939 годзе, затым у савецка-фінляндскай вайне. З нападам Нямеччыны на СССР некаторыя члены сям'і былі мабілізаваныя ў Савецкую Армію, астатнія засталіся на акупаванай тэрыторыі. У гэты час ад хваробы і голаду не стала жонкі Мяхеда Гацака Варвары (1903-1942), ад наступстваў нямецкага палону памёр Даніла Уллянавіч Гацак (1892-1943), знік без вестак Васіль Міхалавіч Гацак (1914-1944), загінуў за 10 дзён да сканчэння вайны кавалер Ордэну "За Адвагу" Міхал Мікалаевіч Гацак (1921-1945).

[19] Архивная справка по материалам архивного уголовного дела № П-84276 в отношении Гоцак (Гацак) Михаила Николаевича // Управление ФСБ России по Хабаровскому краю
[20] Імя Мяхед з'яўляецца беларускім народным варыянтам імя Мяфодзь. У дакументах дадзеная імянная форма сустракаецца на Бабруйшчыне ад XVII ст. У інвентары Бабрусйкага староства за 1639 год яна запісаная як Miechied і, радзей як Miechwied.

У пасляваенны час надышла пара адбудоўваць родны край. Так, Мяхед Уллянавіч Гацак, як камуніст і ўдзельнік вайны, быў прызначаны старшынёй калгасу "Сёмы з’езд саветаў" у суседняй з Лейчыцамі вёсцы Міхалёва-3.

Далейшая гісторыя роду даследавана ў асноўным па нашчадках Мяхеда Гацака, перадусім яго сына Уладзіміра (нарадзіўся ў 1936 годзе). Распісваць яе асобна, па-за радаводным роспісам, няма вялікай патрэбы. Варта адзначыць, што на сённяшні момант прадстаўнікі роду жывуць у Бабруйску і Бабруйскім раёне (вёскі Лейчыцы, Ганчароўка, Рынння, Міхалёва-3), Менску; Расіі (Валгаград, Уладзівасток і іншыя), Канадзе і іншых.

У рэлігійным плане усе вядомыя прадстаўнікі роду ў XIX-XX стст. вызнавалі праваслаўе. Вёска Лейчыцы, лзе пражывалі Гацакі, адносілася да прыходу царквы ў вёсцы Дваранінавічы (да 1875 году), затым – Міхалёва (царква знішчана ў 1930-я гады). Тым не менш у XXI ст. некаторыя прадстаўнікі перайшлі ў каталіцтва.

У розны час прадстаўнікі роду Гацак парадніліся з наступнымі сем’ямі: Бакачы, Балдзенкі, Бялоўскія, Вяроўкі (Вяроўкіны), Калашнікавы, Караваі, Кісялёвы, Манько, Мельнічонкі, Нікалаенкі, Оргішы, Пархіменкі, Сакуны, Сідаровічы, Стральцовы, Шылы, Шырокія, Юшкевічы.

### 1.3. Радавод

Даты нараджэння прадстаўнікоў роду да 1918 году, за выключэннем выпадкаў пазначаных *, даюцца паводле Юліянскага календару (старога стылю), які быў афіцыйным у Расійскай імперыі, а з прыходам да ўлады бальшавікоў быў заменены на Грыгарыянскі каляндар, якім мы карыстаемся да сённяшняга дню. На Беларусі Грыгарыянскі каляндар быў уведзены ў 1584 годзе і скасаваны расійскай адміністрцыяй пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. У XIX ст. Юліянскі каляндар адставаў ад Грыгарыянскага на 12 дзён, у XX ст. – на 13.

Даты ў дужках пасля даты нараджэння пазначаюць дату хросту, пасля даты смерці - дату пахавання. Да 1875 году Лейчыцы адносіліся да прыходу царквы ў Дваранінавічах, пасля 1875 году - царквы ў Міхалёве. Усе вядомыя прадстаўнікі роду, якія жылі да 1918 году ў Лейчыцах, былі пахаваныя на мясцовых вясковых могілках.

#### I пакаленне

**Захар Гацук** (каля 1780-?)

#### II пакаленне

*Дзеці Захара Гацука*

1. **Васіль Гацук** (каля 1815-да 1884), ж. – **Зяновія Яўхімаўна NN** (1822-11 (12) снежня 1890, Лейчыцы).
2. **Міхал Гацук**

#### III пакаленне

*Дзеці Васіля і Зяновіі Гацукоў*

1.1. **Мікола Гацук** (1839, Лейчыцы-29 (31) верасня 1903, Лейчыцы). Селянін, працаваў у маёнтку Рыньня. Быў пісьменным. Прыкладна ў 1866-1873 служыў у расійскай арміі, даслужыўся да званьня старшага унтар-афіцэра. 10 лютага 1862 году ў Дваранінавічах быў хросным Піліпа, сына Конана Якімавіча Вяроўкі і Ганны Піліпаўны з Лейчыцаў. 26 ліпеня 1882 году быў сведкам на шлюбе Марка Данілавіча з Лейчыцаў і Настассі Мартынаўны Манько з Дваранінавічаў. 7 кастрычніка 1882 году быў сведкам на шлюбе Піліпа Конанавіча Вяроўкіна з Лейчыцаў і Аграфены Кліменатаўны Арэшкі з Узногі. У 1884-1886 гадах судзіўся са сваім стрыечным братам Якімам Міхалавічам Гацаком за права валоданне родавымі землямі. 20 студзеня 1891 году быў сведкам на шлюбе Ісака Паўлавіча Шафара з Дваранінавічаў і Марыі Кіпрыянаўны Равуцкай з Лейчыцаў. У 1896-1897 гадах разам з пляменнікам Міхалам Іванавічам Гацаком паўторна судзіўся з Паўлам Сямёнавічам і Уллянай Лук'янаўнай Арэшкамі супраць незаконнай перадачы ім паловы родавых земляў Гацакоў, што належылі Якіму Гацаку. 17 кастрычніка 1899 году быў сведкам на шлюбе Змітра Іванавіча Балдзянка з Хімоў і Аляксандры Аляксееўны Шынц з Дваранінавічаў. Памёр ад запалення лёгкіх. **Шлюб**: 31 студзеня 1865 году, Дваранінавічы, ж. – **Фёкла Кузьмінаўна Вяроўка** (1847, Лейчыцы-?).

1.2. **Іван Гацук** (1841, Лейчыцы-23 (24) ліпеня 1877, Лейчыцы). Ж. – **Агапа Васілеўна** (1837-21 (22) лютага1909, Лейчыцы).

1.3. **Хадора Гацук** (1843, Лейчыцы-?), сялянка. Шлюб: 12 траўня 1863 году, Дваранінавічы, м. – **Лук’ян Ігнатавіч Бакач** (1845, Міхалёва-?).

*Дзеці Міхала Гацука*

2.1. **Якім Гацак** (?-1884?), бязьдзетны. Передаў палову родавых земляў Сямёну Арэшку, які працаваў у яго парабкам.

## IV пакаленне

*Дзеці Міколы і Фёклы з Вяроўкаў Гацукоў*

1.1.1. **Уллян Гацук (Гацак**; 22 (26) чэрвеня 1866, Лейчыцы - да 1938). Селянін, займаўся садоўніцтвам. Ахрышчаны Фамой Клічэўскім пры ўдзеле дыякана Івана Сеўбы. Хросныя бацькі – Зміцер Кузьміч Вяроўка з Рынні ды Грыпіна Міхалаўна Ламанос з Лейчыцаў. 24 студзеня 1899 году быў паручыцелем на шлюбе Пракопа Кіпрыянавіча Манько і Лізаветы Амяллянаўны Манько. 14 студзеня 1901 году разам з Хрысцінай Кіпрыянаўнай, жонкай Міхала Антонавіча Ткача, быў хросным Ганны, дачкі Пракопа Кіпрыянавіча і Лізаветы Амяллянаўны Манько. Ж. – **Параскевія Карпаўна NN** (1867-14 лістапада 1956, Лейчыцы).

1.1.2. **Антон Вяроўка-Гацук** (1873, Лейчыцы-?). Селянін. У 1893-1900 гадах жаўнер расійскай арміі. **Шлюб**: 7 студзеня 1901 году, Міхалёва, ж. – **Хадосся Хведараўна Юшкевіч** (1881, Міхалёва-?).

1.1.3. **Іван Гацук** (1874, Лейчыцы-1 (2) сьнежня 1875, Лейчыцы).

1.1.4. **Макар Гацук** (ліпень 1879, Лейчыцы-10 (12) чэрвеня 1880, Лейчыцы).

1.1.5. **Міхал Гацак** (6 (9) траўня 1881, Лейчыцы-пасля 1932). У 1903-1906 гадах служыў шарагоўцам у тэлеграфнай камандзе ў Порт-Артуры. У 1904-1905 гадах удзельнічаў у расійска-японскай вайне, быў у японскім палоне. У 1906-1907 гадах займаўся садоўніцтвам у Лейчыцах, у- 1907-1909 гадах - рознымі працамі ў Іркуцку і Чыце. У 1909-1924 гадах на Амурскай чыгунцы працаваў дзясятнікам, наглядальшчыкам, загадчыкам тэлеграфнай майстэрні ў горадзе Свабодным, на станцыі Магоча – кантралёрам-механікам сувязі, на станцыі Ерафей Паўлавіч – кантралёрам-механікам, на ст. Магдагачы, на станцыі Біра – на той самай пасадзе. У 1915 годзе скончыў народную вучэльню ў Бортніках (цяпер Бабруйскі раён). У 1924-1925 гадах быў бяз службы, жыў на станцыі Завітая, займаўся праводкай электрычных дротаў. У 1925 годзе – у Хабараўску, у 1931 годзе – перамешчаны на станцыю Біра ў той самай пасадзе. У 1932 годзе працаваў памочнікам начальніка станцыі сувязі, пражываў на станцыі Біра Усурыйскай чыгункі. 20 лютага 1932 года арыштаваны ТА АДПУ станцыі. Біра, абвінавачваўся паводле артыкулу 58-10

КК РСФСР “*за антысавецкую агітацыю супраць мерапрыемстваў, якія ладзяцца савецкай уладай*”. 6 сакавіка 1932 года асуджаны лінейна-транспартнай пракуратурай, справа спыненая праз недаказанасць; вызвалены з-пад варты. 8 ліпеня 1999 года рэабілітаваны па заключэнні пракуратуры Омскай вобласці Расійскай Федэрацыі згодна з законам РФ ад 18 кастрычніка 1991 года. Ж. – **Вольга NN** (1898-?)[21][22].

1.1.6. **Хведар Гацак** (13 (22) красавіка 1884, Лейчыцы-22 (24) сакавіка 1901, Лейчыцы).

• **Дар’я** (9 сакавіка 1870, Лейчыцы-?), незаконнанароджаная дачка Фёклы Кузьміной.

*Дзеці Івана й Агапы Гацукоў*

1.2.1. **Ганна (Алена) Гацук** (10 сьнежня (13) 1858, Лейчыцы-?).

1.2.2. **Марыя Гацук** (1 (2) красавіка 1861, Лейчыцы-?). **Шлюб:** 29 ліпеня 1877 года, Міхалёва, м. – **Адам Восіпавіч** (1851, Лейчыцы-?).

1.2.3. **Таццяна Гацук** (14 (14) студзеня 1863, Лейчыцы-?).

1.2.4. **Ганна Гацук** (4 (5) лютага 1865, Лейчыцы-?).

1.2.5. **Соф’я Гацук** (**Пуцак?**; 1866, Лейчыцы-?). **Шлюб**: 21 студзеня 1896 года, Міхалёва, м. – **Пятро Цярэнцевіч Мельнічонак** (1871, Тажылавічы-?).

1.2.6. **Сцяпан Гацук** (27 (28) снежня 1867, Лейчыцы-16 (18) чэрвеня 1871, Лейчыцы).

1.2.7. **Міхал Гацук** (**Гацак**; 7 (20) верасня 1870, Лейчыцы-?). **Шлюб**: 18 кастрычніка 1892 года, Міхалёва, ж. – **Элеанора Андрыянаўна Пархіменка** (1876, Кавалі-14 (15) лістапада 1915, Лейчыцы).

1.2.8. **Алена Гацук** (**Гацак**; 1875, Лейчыцы-?). **Шлюб**: 22 траўня 1895 года, Міхалёва, м. – **Яўсей Рыгаравіч Сакун** (1876, Жылінцы-?)

---

[21] Гоцак Михаил Николаевич. Жертвы политического террора в СССР // http://lists.memo.ru/index4.htm

[22] Архивная справка по материалам архивного уголовного дела № П-84276 в отношении Гоцак (Гацак) Михаила Николаевича // Управление ФСБ России по Хабаровскому краю

## V пакаленьне

*Дзеці Улляна і Параскевіі Гацукоў (Гацакоў)*

1.1.1.1. **Васіль Гацак** (31 снежня 1890 (1 студзеня 1891), Лейчыцы-18 (20) студзеня 1891, Лейчыцы).

1.1.1.2. **Даніла Гацак** (17 (26) снежня 1892, Лейчыцы-5 снежня 1943). Улетку 1941 мабілізаваны ў савецкае войска, патрапіў у нямецкі палон. Памёр пасля вяртання з палону, пахаваны на могілках у вёсцы Барак. Ж. – **Вольга Аляксандраўна Каравай** (6 ліпеня 1901-14 верасьня 1978)*.

1.1.1.3. **Міхал Гацак** (7 (12) лістапада 1895, Лейчыцы-?). Перасяліўся ў Дваранінавічы. Ж. – **Ганна**.

1.1.1.4. **Андрэй Гацак** (16 (17) студзеня 1899, Лейчыцы-?). Жыў у Хабараўску.

1.1.1.5. **Наталля Гацак** (15 (18) лютага 1901, Лейчыцы-1973). М. – **Аляксандр Рыгоравіч Вяроўкін** (1899-1962).

1.1.1.6. **Мяфодзь (Мяхед) Гацак** (11 (12) траўня 1903, Лейчыцы-5 лістапада 1979, Міхалёва). Ахрышчаны святаром Іванам Шыманоўскім пры ўдзеле псаломшчыка Паўла Мірановіча, хросныя бацькі – Пятро Андрэевіч Вяроўкін з Лейчыцаў і Настасся Яўстахаўна Бяляўская з Дварцу. У 1911-1914 гадах навучаўся ў царкоўна-прыходзкай школе. У 1925 годзе ўпершыню заклікаными на вайсковую службу, служыў у 62 артылерыйскім палку[23]. У 1930-я гады ўступіў у калгас, быў сябрам камуністычнай партыі[24]. 7 верасня 1939 годзе мабілізаваны на вялікія навучальныя зборы ў 62-ы артылерыйскі полк[25], які ўваходзіў у склад 8-й стралковай Менскай Чырвонаштандарнай ордэна Працоўнага Чырвонага Штандару дывізіі імя Ф.Э.Дзяржынскага. 17-30 верасня 1939 году 8-я дывізія ўдзельнічала ў савецкім уварванні ў Польшчу (у складзе 16-га стралковага корпусу 11-й арміі Беларускага фронту). 17 верасня 1939 году 8-я СД у складзе Слуцкай групы савецкіх войскаў захапіла

---

[23] Военный билет Мифодия Ульяновича Гоцака
[24] Успаміны Уладзіміра Мяфодзевіча Гацака
[25] Военный билет Мифодия Ульяновича Гоцака

Нясвіж і выйшла да Снова, 18 верасня дывізія прайшла праз Баранавічы, 19 верасня дасягнула ракі Шчара, 20-га ўвайшла ў Ружаны. 23 верасня ля Відамлю немцы абстралялі конны выведбатальён 8-й дывізіі, у выніку чаго 2 чалавекі былі забітыя, 2 параненыя. У адказ быў знішчаны нямецкі танк з экіпажам. Затым 8-я дывізія ўвайшла ў Пружаны. 24 верасня дывізія ля Брэста пераправілася праз Заходні Буг. 25 верасня падначаленая 23-му стралковаму корпусу. 29 верасня 8-я дывізія заняла Лукаў, 30 верасня ўдзельнічала ў баях з польскім войскам каля Белай-Падляскай[26].

7 студзеня 1940 году 8-я стралковая дывізія была выведзеная з Польшчы і 22 студзеня ўвайшла ў склад войскаў Паўночна-Заходняга фронту, дзе распачала свой удзел у Савецка-фінскай вайне. 24 студзеня 1940 году дывізія прыбыла на Карэльскі перашыек у раён вёсак Майніла і Інаніемі (цяпер Пясочнае), знаходзілася ў складзе 13-га стралковага корпусу. 27 студзеня 1940 году прыбыла ў вёску Пампала (цяпер Чырвоны Курган). Ад 31 студзеня 1940 году на передавой у складзе 23-га стралковага корпусу, ад 11 лютага 1940 году атакавала паўночна-ўсходняе ўзбярэжжа возера Муалаан-ярві (цяпер Глыбокае). 8 сакавіка 1940 году перададзеная ў склад 15-га стралковага корпусу. Выведзеная з памежнай паласы 1 красавіка 1940 году. 27 красавіка-5 траўня 1940 году пераведзеная ў Беларусь у раён Брэста[27][28]. Звольнены ў запас 20 траўня 1940[29].

Улетку 1941 году здолеў пазбегнуць мабілізацыі ў савецкае войска, аднак як партыйны мусіў хавацца ад нямецкіх уладаў (сям'я два тыдні была закладніцай у Бабруйскай крэпасці), а таксама ад савецкіх партызанаў[30]. 30

[26]http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9F%D0%BE%D0%BB%D1%8C%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D0%BF%D0%BE%D1%85%D0%BE%D0%B4_%D0%A0%D0%9A%D0%9A%D0%90_(1939)

[27] http://kannas.nm.ru/rkka.htm

[28] http://ru.wikipedia.org/wiki/8-%D1%8F_%D1%81%D1%82%D1%80%D0%B5%D0%BB%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D1%8F_%D0%B4%D0%B8%D0%B2%D0%B8%D0%B7%D0%B8%D1%8F_(1-%D0%B3%D0%BE_%D1%84%D0%BE%D1%80%D0%BC%D0%B8%D1%80%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D0%B8%D1%8F)

[29] Военный билет Мифодия Ульяновича Гоцака

[30] Успаміны Уладзіміра Мяфодзевіча Гацака

чэрвеня 1944 году мабілізаваны бабруйскім РВК у 146-ы армейскі запасны стралковы полк стралком. У ліпені 1944 годзе пераведзены ў 356-ы артылерыйскі Далёкаўсходні ордэна Аляксандра Неўскага полк, прыняў прысягу 23 жніўня 1944 году[31]. Полк уваходзіў у склад 102-й Далёкаўсходняй Ноўгарад-Северскай ордэна Леніна Чырвонаштандарнай ордэна Аляксандра Суворава дывізіі. Тая ў сваю чаргу ўваходзіла ў склад 29-га стралковага корпусу 48-й арміі. У ліпені-верасьні і лістападзе 1944 годзе 48-я армія ўваходзіла ў склад 1-га Беларускага фронту, у кастрычніку 1944 году і сьнежні 1944-лютым 1945 гадоў – 2-га Беларускага фронту, сакавіку-траўні 1945 году – 3-га Беларускага фронту. 3 верасьня 1944 году дывізія, прайшоўшы праз Беларусь выйшла да ракі Нараў. Вяла цяжкія баі на подступах да ракі, за 10-12 кіламетрах ад яе. Месцамі дывізія была змушана пакінуць пазіцыі, месцамі абарона дывізіі была прарваная, аднак тым самым дывізія адцягнула на сябе сілы праціўніка і дазволіла іншым злучэнням корпусу фарсіраваць Нараў. У верасні 1944 перапраўленая на Нараўскі пляцдарм, 10-16 кастрычніка 1944 прарывае абарону праціўніка ў раёне вёскі Свента-Разалія (Польшча) у баях за пашырэнне пляцдарму на рацэ Нараў каля горада Серацк, затым трымае абарону на пляцдарме да студзеня 1945 году. Падчас Усходне-Прускай аперацыі з 13 студзеня 1945 году наступае з Нараўскага пляцдарму, выйшла да Млаўскага ўмацаванага раёну, працягнула наступ у кірунку на Эльбінг, куды выйшла ў студзені 1945 году, і затым вяла баі ў тым самым раёне, наступаючы на Браўнзберг, ліквідуе хайлінгбойльскую групоўку ворага. Так, 21 лютага 1945 году вядзе бой каля населенага пункта Шэндамэраў (Усходняя Прусія, цяпер Дамброва). У канцы красавіка-пачатку траўня 1945 году часткай сіл вяла баявыя дзеянні на касе Фрышэс-Нэрунг, а іншай часткай выконвала задачы кашталянскай службы ў горадзе Эльбінгу. Скончыла вайну большай часткай у горадзе Браўнзберг. 9 траўня 1945 году дывізія выйшла ў сяло Толькеміт на ўзбярэжжа заліва

[31] Военный билет Мифодия Ульяновича Гоцака

Фрышэс-Гаф, насупраць касы Фрышэс-Нэрунг[32]. Дэмабілізаваны 17 жніўня 1945 году. Узнагароджаны 9 чэрвеня 1945 медалём “За ўзяццё Кёнігсбергу”, 9 траўня 1945 году – “За Перамогу над Нямеччынай”[33].

Верагодна, у 1946-1948 старшыня калгасу "Сёмы з’езд саветаў" у вёсцы Міхалёва-3. Затым працаваў брыгадырам, загадваў на палявых працах. Памёр у шпіталі ў Міхалёве[34]. Пахаваны на вясковых могілках у Лейчыцах.Жонкі: 1.**Варвара Ўладзімераўна Шырокая** (5 (18) снежня 1903, Міхалёва-25 сакавіка 1942, Лейчыцы); 2. **Вольга Піліпаўна Оргіш** (1917, Построш-1956, Лейчыцы); 3. **Тамара Парфёнаўна Бялоўская** (1912-1973)

1.1.1.7. **Марыя Гацак** (25 (28) чэрвеня 1905, Лейчыцы-?). Жыла ў Машках. М. – **Кісялёў**.

1.1.1.8. **Ганна Гацак** (15 (17) ліпеня 1907, Лейчыцы-4 (5) лістапада 1910, Лейчыцы).

1.1.1.9. **Ганна Гацак** (27 чэрвеня (1 ліпеня) 1912, Лейчыцы-22 (23) лістапада 1913, Лейчыцы).

*Дзеці Антона і Хадоссі з Юшкевічаў Гацакоў*

1.1.2.1. **Мяфодзь Гацак** (11 (12) кастрычніка 1901, Лейчыцы-?).

1.1.2.2. **Алімпіяда Гацак** (21 (22) лютага 1904, Лейчыцы-?).

1.1.2.3. **Павел Гацак** (14 (20) красавіка-18 (19) чэрвеня 1907, Лейчыцы).

*Дзеці Міхала і Вольгі Гацакоў*

1.1.5.1. **Віктар Гацак** (1921-)

1.1.5.2. **Вера Гацак** (1923-)

*Дзеці Міхала і Элеаноры (Алены) з Пархіменкаў Гацакоў*

---

[32] http://ru.wikipedia.org/wiki/102-%D1%8F_%D1%81%D1%82%D1%80%D0%B5%D0%BB%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D1%8F_%D0%B4%D0%B8%D0%B2%D0%B8%D0%B7%D0%B8%D1%8F_(3-%D0%B3%D0%BE_%D1%84%D0%BE%D1%80%D0%BC%D0%B8%D1%80%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D0%B8%D1%8F)

[33] Военный билет Мифодия Ульяновича Гоцака

[34] Успаміны Уладзіміра Мяфодзевіча Гацака

1.2.7.1. **Мікалай Гацак** (22 (23) кастрычніка 1893, Лейчыцы-?). У 1945 пражываў у калгасе “Красіна” Рагачоўскага раёну Бабруйскай вобласці[35], пасля ў Рагачове.

1.2.7.2. **Кацярына Гацак** (24 (25) чэрвеня 1896, Лейчыцы-?).

1.2.7.3. **Пятро Гацак** (27 (27) чэрвеня 1901, Лейчыцы-?).

1.2.7.4. **Апанас Гацак** (21 (22) лютага 1904, Лейчыцы-12 (13) верасня 1905, Лейчыцы).

1.2.7.5. **Ганна Гацак** (1906, Лейчыцы-6 (7) сакавіка 1909, Лейчыцы).

1.2.7.6. **Ганна Гацак** (26 (29) сакавіка 1909, Лейчыцы-7 (8) жніўня 1915, Лейчыцы).

1.2.7.7. **Уладзімір Гацак** (кастрычнік 1911, Лейчыцы-17 (18) студзеня 1914, Лейчыцы).

1.2.7.8. **Васіль Гацак** (1 (2) студзеня 1914, Лейчыцы-кастрычнік 1944). У 1944 годзе закліканы ў Савецкую армію. Служыў у п/п 01001-Щ, знік без вестак у кастрычніку 1944 году. Ж. – **Пелагея Пятроўна**[36][37].

## VI пакаленне

*Дзеці Данілы і Вольгі з Каравашў Гацакоў*

1.1.1.2.1. **Іван Гацак** (25 снежня 1923-30 лістапада 2002). Пахаваны на могілках у вёсцы Барак. Ж. – **Надзея Васілеўна** (3 траўня 1925-28 красавіка 1996).

1.1.1.2.2. **Галіна Гацак** (18 траўня 1928-20 лістапада 1995). Пахаваная на могілках у вёсцы Барак. М. – **Манько**.

1.1.1.2.3. **Генадзь Гацак (**нарадзіўся ў 1932**)**.

*Дзеці Міхала і Ганны Гацакоў*

---

[35] Гацак Михаил Николаевич // Именной список безвозвратных потерь рядового и сержантского состава 362-й отдельной Армейской штрафной роты. За период с 20.4. по 30.04.1945 г. obd-memorial.ru

[36] Гацак Василий Михайлович // obd-memorial.ru

[37] Загінуўшыя воіны-землякі // Памяць. Бабруйск. – Мн., Вышэйшая школа. – ст.524

1.1.1.3.1. **Зоя Гацак**, жыве ў Расіі.

1.1.1.3.2. **Іван Гацак**

1.1.1.3.3. **Леанід Гацак** (?-каля 2008, Менск).

*Дзеці Андрэя Гацака*

1.1.1.4.1 **Раіса Гацак**, жыве ва Ўладзівастоку.

*Дзеці Мяфодзя і Варвары з Шырокіх Гацакоў*

1.1.1.6.1. **Мікалай Гацак** (16 кастрычніка 1928, Лейчыцы-13 снежня 1982). Пахаваны на вясковых могілках у Лейчыцах. Ж. – **Ганна Канстанцінаўна** (12 лютага 1927-16 снежня 1991).

1.1.1.6.2. **Уладзімір Гацак** (нарадзіўся 15 чэрвеня 1936, Лейчыцы). У 1941 годзе утрымліваўся немцамі разам з сям'ёй на працягу двух тыдняў у Бабруйскай крэпасці на фарштаце. Скончыў Міхалёўскую сярэднюю школу. У 1955-1958 гадах служыў матацыклетчыкам у выведбатальёне ў савецкім войску (спачатку ў горадзе Нойрупін, затым у Віштаку - Нямецкая Дэмакратычная Рэспубліка). У 1958-1960 гадах працаваў пажарным у Бабруйску, пераехаў жыць у Бабруйск. У 1960-1963 гадах кіроўца аўтамабілю на тарным заводзе ў вёсцы Цітаўка. У 1963-1966 гадах кіроўца ў аўтобусным парку. У верасні 1966-1998 гадах працаваў кіроўцам у Бабруйскім спэцаўта прадпрыемстве. Ад 1996 году на пэнсіі. У 1993 годзе пераехаў з жонкай і дачкой Тацянай у Ганчароўку Бабруйскага раёну, дзе заняўся сельскай гаспадаркай. **Шлюб**: 15 лістапада 1959 году, ж. – **Соф'я Канстанцінаўна Балдзенка** (29 кастрычніка 1937, Ганчароўка-29 жніўня 1998, Ганчароўка)[38].

1.1.1.6.3 **Ларыса Гацак** (нарадзілася 20 траўня 1937, Лейчыцы). Жыве ў Лейчыцах. Працавала ў калгасе на палявых працах, даяркай. М. – **Леанід Манько**[39].

[38] Успаміны Уладзіміра Мяфодзевіча Гацака
[39] Успаміны Валянціны Мяфодзеўны Нікалаенкі (Гацак)

1.1.1.6.4. **Соф'я Гацак** (1 сакавіка 1939, Лейчыцы-8 лютага 2010, Клічаў). М. – **Яўген Вяроўкін**[40].

*Дзеці Мяфодзя і Вольгі з Оргішаў Гацакоў*

1.1.1.6.5. **Валянціна Гацак** (нарадзілася 1 кастрычніка 1950, Лейчыцы). У 1967 годзе скончыла Міхалёўскую СШ. Навучалася да 1969 году ў горадзе Чарняхоўск Калінінградскай вобласці РСФСР. У 1969-1973 гадах працавала ў Бабруйску выхавацелем у дзіцячым садку № 48. З 1975 году выхавацель дзіцячага садку 1-й мінскай птушкафабрыкі (пасёлак Бальшавік Мінскага раёну), з 1990 году загадчыца. Шлюб: 25 лістапада 1972 году, Бабруйск, м. - **Генадзь Захаравіч Нікалаенка** (20 красавіка 1949, в. Бранцава, Аршанскі раён)[41].

1.1.1.6.6. **Вера Гацак** (нарадзілася 15 ліпеня 1948, Лейчыцы). Скончыла Міхалёўскую школу, Баранавіцкі тэхналагічны тэхнікум. Працавала ў Нямеччыне. 16 гадоў жыла ў Чыце. Пераехала ў Валгаград, дзе і жыве. Шлюб: 1973, м. - **Барыс Іванавіч Калашнікаў**, ваенны лётчык[42].

*Дзеці Мікалая Гацака*

1.2.7.1.1. **Іван Гацак** (1919, Бабруйскі раён-?), скончыў 5 класаў школы сябар ВЛКСМ. У савецкім войску ад 1939 году. У 1944 годзе стралок 5-й заставы 2-га Памежнага палку войскаў НКУС па ахове тылу І-га Ўкраінскаа фронту. "*18.2.1944 году ў баі з бандай УПА (Украінскай паўстанцкай арміі – аўт.) выявіў адвагу, мужнасць і гераізм. Тав. ГАЦАК на сваю ініцыятыву зайшоў у фланг групе бандытаў і знянацку адкрыў агонь, у выніку панікі, якая ўзнялася сярод бандытаў, банда была знішчана. Сам ГАЦАК знішчыў двух бандытаў і двух захапіў у палон. 6 сакавіка 1944 году ў баі ў раёне с.Куніна ўбачыў групу бандытаў, якія ўцякалі да лесу, агнём з ручнога кулямёту тав.*

[40] Успаміны Валянціны Мяфодзеўны Нікалаенкі (Гацак)
[41] Успаміны Валянціны Мяфодзеўны Нікалаенкі (Гацак)
[42] Успаміны Валянціны Мяфодзеўны Нікалаенкі (Гацак)

*ГАЦАК забіў аднаго бандыта, астатніх змусіў здацца ў палон*". 31 сакавіка 1944 году ўзнагароджаны мэдалём "За адвагу"[43].

1.2.7.1.2. **Міхал Гацак** (1921, Рыння, Міхалёўскі сельсавет, Бабруйскі раён - 30 красавіка 1945, Берлін, Трэці Рэйх). У 1930-я гады пражываў у калгасе імя А.Б.Красіна (цэнтар - вёска Барак, Міхалёўскі сельсавет, Бабруйскі раён). У верасні 1940 году мабілізаваны ў РСЧА, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны ад самага яе пачатку. У 1942 годзе старшы сяржант, механік-кіроўца танку Т-60 301-га танкавага батальёну 104-й танкавай брыгады 41-арміі Калінінскага фронту. У 1942-1943 гады 41-я армія ўдзельнічала ў Другой Ржэўска-Сычоўскай і Ржэўска-Вяземскай аперацыях. 28 жніўня 1942 году паранены. "*Тав. Гацак у баях супраць нямецкіх акупантаў выявіў узоры трываласці, мужнасці ды адвагі. Ідучы наперадзе пяхоты першым уварваўся ў асноўны пункт супраціву пр-ка Дуброўка, падавіў тры кулямётныя кропкі пр-ка, разагнаў два разлікі 150 мм гармат, чым забяспечыў вызваленне вёскі ад захопнікаў. 26 лістапада 1942 г. двойчы хадзіў у атаку на Пшанічына, дзе знішчыў больш за 30 немцаў. Удзельнічаючы ў блакаванні ДЗОТу з пяхотай – выгнаў дымавай гранатай фашыстаў з бліндажу, разстраляў з іх 10 жаўнераў і афіцэраў, пры тым захапіў 2-х палонных. Машыну заўсёды ўтрымлівае на баявым пагатове*". 28 лістапада 1942 году ганараваны Ордэнам "За Адвагу"[44]. У 1945 годзе стралок 362-й асобнай Армейскай штрафной роты, старшына. 30 красавіка 1945 году забіты на паўднёвай ускраіне Берліна[45].

## VII пакаленне

*Дзеці Мікалая й Ганны Гацакоў*

1.1.1.6.1.1. **Валянціна Гацак**.

---

[43] Гацак Иван Николаевич // podvig-naroda.ru

[44] Гоцак Михаил Николаевич // podvig-naroda.ru

[45] Гацак Михаил Николаевич // Именной список безвозвратных потерь рядового и сержантского состава 362-й отдельной Армейской штрафной роты. За период с 20.4. по 30.04.1945 г. obd-memorial.ru

1.1.1.6.1.2. **Мікалай Гацак**.

1.1.1.6.1.3. **Валер Гацак**.

*Дзеці Уладзіміра і Соф'і з Балдзенкаў Гацакоў*

1.1.1.6.2.1. **Ала Гацак** (нарадзілася 3 сакавіка 1961, Бабруйск). М. – **Мікалай Іванавіч Шыла**.

1.1.1.6.2.2. **Віктар Гацак** (нарадзіўся 9 траўня 1965, Бабруйск). У 1972-1982 гадах навучаўся у СШ № 5 г. Бабруйску (цяпер Гімназія № 3). 1 верасня 1982-25 ліпеня 1983 навучаўся ў Тэхнічнай вучэльні № 95 хімікаў гораду Бабруйска, атрымаў спецыяльнасць слесара па рамонце аўтамабіляў 3-га разраду. 28 верасня 1996 году атрымаў кваліфікацыю кіроўцы аўтапагрузчыку. 1 жніўня 2003 году атрымаў кваліфікацыю кіроўцы электратэхнікі. 4 лістапада 1983-29 лістапада 1985 году служыў у савецкім войску. Ад 15 лістапада 1983 году курсант у вайсковай частцы 20039. Ад 16 красавіка 1984 году мэханік тэлефаніст 3-га класу. Ад 8 траўня 1984 году ў вайсковай частцы 22680. Ад 13 лістапада 1984 году старшы механік-тэлефаніст (старшы механік засакрэчваючай тэлефоннай (часовай трываласці) апаратуры сувязі). У 1988 і 1990 гадах праходзіў вайсковыя зборы. Ад 1985 году працуе на Бабруйскім заводзе трактарных дэталяў і агрэгатаў. **Шлюб**: 11 кастрычніка 1986 году, Бабруйск, ж. – **Наталля Пятроўна Сідаровіч** (нарадзілася 28 красавіка 1968, Ганчароўка)[46].

1.1.1.6.2.3. **Таццяна Гацак** (нарадзілася 2 ліпеня 1975, Бабруйск).

## VIII пакаленне

*Дзеці Віктара і Наталлі з Сідаровічаў Гацакоў*

1.1.1.6.2.2.1. **Максім Гацак** (нарадзіўся 14 студзеня 1988, Бабруйск). Ахрышчаны паводле праваслаўнага абраду ў лютым 1988 году ў Свята-Мікола-Сафійскай царкве ў Бабруйску, 4 кастрычніка 2007 году перайшоў у

[46] Успаміны і асабістыя дакументы Віктара Уладзіміравіча Гацака

каталіцтва. У 1989-1994 гадах наведваў дзіцячы садок № 27. У 1994-2003 гадах навучаўся ў Славянскай гімназіі г. Бабруйску (цяпер Гімназія № 3), у 2003-2005 - у Ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту ў Менску, спецыялізацыя гісторыя, у 2005-2010 гадах - на Факультэце міжнародных бізнес-камунікацыяў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэту, ад 2010 году - у Беларускім калегіюме на аддзяленні Найноўшай гісторыі. Ад сакавіка 2010 журналіст і перакладчык на навіновым партале Telegraf.by. У 2003-2005 гадах – прызёр рэспубліканскіх алімпіяд па гісторыі, ад 2006 удзельнік гульняў па "Што?Дзе?Калі?" у складзе каманды БДЭУ "Утечка мозгов". Ад лютага 2010 году стваральнік і адміністратар сайту бабруйскай каталіцкай парафіі Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі - www.katolikbk.org. 11 траўня 2010 году ўступіў у грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны". **Шлюб**: 19 ліпеня 2008 году, Менск, ж. – **Надзея Аляксееўна Стральцова** (нарадзілася 26 снежня 1986, Менск)[47].

1.1.1.6.2.2.2. **Канстанцін Гацак** (нарадзіўся 20 сакавіка (12 красавіка) 1998, Бабруйск). Ахрышчаны паводле праваслаўнага абраду 12 красавіка 1988 году ў Святагеоргіеўскай царкве ў Бабруйску, іярэй – Сяргей Лабада. У 2001-2004 гадах наведваў дзіцячы садок № 27. Ад 2004 году навучаецца ў Гімназіі № 3 г. Бабруйску, спецыялізацыя матэматыка. Шматразовы ўдзельнік конкурсаў па агульнаадукацыйных прадметах (беларускай і англійскай мовах, матэматыцы).

## IX пакаленне

*Дзеці Максіма і Надзеі са Стральцовых Гацакоў*

1.1.1.6.2.2.1.1. **Рагнеда Адэля Гацак** (нарадзілася 12 траўня (10 кастрычніка) 2009, Менск). Ахрышчаная 10 кастрычніка 2009 у Касцёле святога Сымона і

[47] Успаміны і асабістыя дакументы Максіма Віктаравіча Гацака

святой Алены ў Менску. Сакрамант хросту ўдзяліў ксёндз Аляксандар Фаміных.

## 1.4. Лейчыцы

**Лейчыцы** — вёска ў Бортніцкім сельсавеце Бабруйскага раёну, за 10 км ад чыгуначнай станцыі Цялуша на лініі Бабруйск — Жлобін, каля шашы Бабруйск — Рагачоў, за 18 км ад Бабруйску, за 92 км ад Магілёва. Родавае гняздо Гацакоў.

Назва вёскі ўтварылася ад імя Ілля ці прозвішча/імя па бацьку Ілейчыц, якое ў сваю чаргу ўтварылася ад узгаданага імя. Першапачатковы варыянт назвы - Ілейчычы (Ilejczycze)[48].

Вёска вядомая з пісьмовых крыніцаў ад 1621 году як сяло Бабруйскага староства Менскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага. У ёй было 6 двароў, дзяржаўная ўласнасць. лейчыцы былі нададзеныя Ганне з Масальскіх, жонцы бабруйскага старосты Пятра Трызны.

Ад 1793 году вёска ў складзе Расійскае імперыі, ад 1795 году ў Бабруйскім павеце. У 1838 году 55 рэвізскіх душаў, уласнасць паноў Прушыноўскіх. Паводле перапісу 1897 году — вёска Бортніцкай воласці Бабруйскага павету, 32 двары, 224 жыхары.

У 1907 годзе - 44 двары, 340 жыхароў, 1917 годзе - 46 двароў, 340 жыхароў. У 1920 годзе адчыненая пачатковая школа, у якой у 1925 годзе навучалася 35 хлопчыкаў і дзяўчынак. У 1925 годзе да вёскі далучаны вялікі ўчастак былой панскай зямлі. Паводле перапісу 1926 году 68 двароў, 274 жыхары. У 1930 годзе створаны калгас імя А. І. Ягорава. У Вялікую. Айчынную вайну на фронце загінула 23 вяскоўцы.

Паводле перапісу 1959 году - 248 жыхароў, у 1970 - 250. У 1986 годзе 68 двароў, 155 жыхароў, дзейнічаў клуб, сама вёска ўваходзіла ў склад калгасу імя Фелікса Дзяржынскага. На пачатак 1997 году 55 двароў, 100 жыхароў, у 2007 - 41 і 85.

---

[48] Инвентарь Бобруйскага староства // Акты, издаваемые Виленсою коммиссіею для разбора древнихъ актовъ. Томъ XXV. Инветари и разграничительные акты. – Вильна, 1898 – стр. 233-235

Вёска арыентаваная з усходу на захад уздоўж аўтадарогі Бабруйск-Рагачоў. Забудова ў вёсцы двухбаковая, драўляная, сядзібнага тыпу[49][50].

[49] Лейчыцы // Памяць. Бабруйскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 1998. — С. 577;
[50] Лейчыцы // Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т.5. кн.1. Магілёўская вобласць / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 2008. — С. 185.

## 2. Гацакі (вёска Дваранінавічы, цяпер Кіраўскі раён)

### 2.1. Гісторыя роду

**Гацакі** - беларускі сялянскі род, прадстаўнікі якога пражывалі ў вёсцы Дваранінавічы Бортніцкай воласці Бабруйскага павету (цяпер – Дваранінавіцкі сельсавет Кіраўскага раёну).

Першы вядомы прадстаўнік – Павал Гацак (каля 1790-?). Месца нараджэння і прычыны яго ці яго продкаў з’яўлення на Бабруйшчыне пакуль невядомыя. На жаль, вядомыя толькі некалькі прадстаўнікоў роду, якія незаўсёды ўпісваюцца ў агульны радавод.

Цалкам, верагодна, што сваяком Паўла быў Захар Гацук (нарадзіўся каля 1780), які жыў у вёсцы Лейчыцы Бортніцкай воласці Бабруйскага павету. Павал і яго нашчадкі былі сялянамі, займаліся сельскай гаспадаркай. У рэлігійным плане усе вядомыя прадстаўнікі роду вызнавалі праваслаўе.

Сёння прадстаўнікі роду ў Кіраўскім раёне незафіксаваныя.

### 2.2. Радавод

**I пакаленне**

1. Павел Гацак (каля 1790-?)

**II пакаленне**

*Дзеці Паўла Гацака*

1.1. Лявон Гацак (1820-19 (21) жніўня 1895)

**III пакаленне**

*Дзеці Лявона Гацака*

1.1.1. Навум Гацак

1.1.2. Кірыла Гацак, ж. – Ксенія Ісакаўна

## IV пакаленне

*Дзеці Навума Гацака*

1.1.1.1. Аляксей Гацак (1893-17 (19) верасня 1896)

*Дзеці Кірылы Гацака*

1.1.2.1. Феафан Гацак (28 (29) верасня – 19 (21) снежня 1896)

## Іншыя асобы

Максім Гацак (1875-17 (19) лютага 1878), сын  Адама Аляксеевіча Гацака

Трафім Гацак (22 (23) ліпеня 1892-?), сын Адама Мацвеевіча (?) і Хадоры Клімаўны Гацакоў

## 2.3. Дваранінавічы

Вёска Дваранінавічы, альбо цяпер Старыя Дваранінавічы, знаходзіцца ў Паўлавіцкім сельсавеце Кіраўскага раёну Магілёўскай вобласці за 18 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад раённага цэнтру недалёка ад аўтадарогі Бабруйск-Рагачоў.

Дваранінавічы (Dworaninowicze) вядомыя як сяло Бабруйскай воласці Рэчыцкага павету Менскага ваяводства ад 1560 году. У 1621 годзе было 14 дымоў, у 1639 годзе тут дзейнічала праваслаўная Святаюр’еўская царква. У 1793 годзе вёска адышла да Расійскай імперыі, увайшоўшы ў Бабруйскі павет Менскай губерні. У 1778 годзе вёска ўваходзіла ў склад маёнтку Рыньня Юзафа Прушаноўскага, у ёй дзейнічала царква, працавала “карчма з сенцамі”.[51]

У 1839 годзе Святаюр’еўскя царква была пераведзеная з уніяцтвва ў праваслаўе. У 1875 годзе яна была пазбаўленая статусу парафіяльнай і ўвайшла ў склад Міхалёўскага прыходу. У 1885 годзе ў Дваранінавічах было 33 двары і 330 жыхароў, дзейнічаў вятрак. У 1897 годзе вёска была ў Бортніцкай воласці Бабруйскага павету, у ёй налічвалася 85 двароў і 587 жыхароў. Побач існаваў аднайменны пасёлак з трох двароў з 11 жыхарамі. У 1907 у Дваранінавічах ужо было 104 двары і 728 жыхароў, у наёмным памяшканні дзейнічала земская школа. У 1917 колькасць двароў была 112, жыхароў – 732.

У 1920-я гады на базе земскай паўстала чатырохгадовая школа, у якой у 1923 годзе навучалася 103 вучні. У 1926 была адчыненая хата-чытальня, у 1929 – арганізаваны калгас “Прамень Савета”. Падчас другой сусветнай вайны ў траўні 1944 году немцы жыўцом спалілі ў вясковай лазні 23 чалавекі. Яшчэ 19 вяскоўцаў загінулі на фронце.

---

[51] Инветарь фольварка Рыни, Р□чицкаго пов□та, и его волости, Іосифа Прушановскаго. № 66 – 1778 г. Апр□ля 23. // Акты, издаваемые Виленскою коммиссіею для разбора древнихъ актовъ. Том XXV. Инветари староствъ, им□ній, фольварковъ и деревень за вторую половину XVIII в□ка (1751-1789). – Вильна, 1910.

У 1959 годзе ў вёсцы жыло 586 чалавек, у 1986 – 234, было 120 гаспадарак, дзейнічалі клуб, бібліятэка, крама, фельчарска-акушэрскі пункт. Самі Дваранінавічы ўваходзілі ў калгас «Чырвоны баец» з цэнтрам у вёсцы Паўлавічы. У 2002 годзе тут было 83 гаспадаркі і 195 жыхароў. Па стане на 2007 год у Старых Дваранінавічах пражывае 163 чалавекі, налічваецца 69 гаспадарак, працуюць фельчарска-акушэрскі пункт і крама.

Аснову вёскі складае прамалінейная вуліца, арыентаваная з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход. Паралельна да яе на поўнач праходзіць яшчэ адна кароткая вуліца. Забудова вёскі пераважна двухбаковая, драўляная, з адвольнай расстаноўкай сядзіб[52].

[52] Старыя Дваранінавічы // Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т.6. кн.2. Магілёўская вобласць / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 2009. — С. 57.

## 3. Гацукі (вёска Атрошкавічы, цяпер Бабруйскі раён)

### 3.1. Гісторыя роду

**Гацукі** (таксама вядомыя як **Гатцукі, Гацукі-Лаўрынёнкі, Лаўрынёнкі**) – беларускі сялянскі род, прадстаўнікі якого ад 1830-х гадоў пражывалі ў вёсцы Атрошкавічы Гарбацэвіцкай воласці Бабруйскага павету (цяпер – Гарбацэвіцкі сельсавет Бабруйскага раёну). У архіўных дакумэнтах прадстаўнікі роду зафіксаваныя як *Гацукъ, Гацукъ-Лавриненокъ, Лавриненокъ-Гацукъ, Гатцукъ, Лавриненокъ*.

Першы вядомы прадстаўнік – Сымон Гацук (каля 1820-паміж 1859 і 1905). Месца нараджэння і прычыны яго з’яўленьня на Бабруйшчыне пакуль невядомыя. Пэўны час у другой палове XIX ст. прадстаўнікі роды карысталіся падвоенным прозвішчам – Гацук-Лаўрынёнак ці проста Лаўрынёнак, што можа быць сведчаннем таго, што жонкай Сымона Гацука магла быць прадстаўніца роду Лаўрынёнкаў з суседняй вёскі Старцы.

Цалкам, верагодна, што сваяком Сымона быў Захар Гацук (нарадзіўся каля 1780), які жыў у вёсцы Лейчыцы Бортніцкай воласці Бабруйскага павету. Версія іх сваціятва патлумачаная ў асноўнай частцы. Сымон і яго нашчадкі былі сялянамі, займаліся сельскай гаспадаркай, садоўнітцвам. Прынамсі трое Гацукоў загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны – лейтэнант Гаўрыла Навумавіч Гацук (знік без вестак), партызан Іван Алексяевіч Гацук (у лютым 1943 году) і Аляксей Міхалавіч Гацук (11 сакавіка 1945 году).

Прадстаўнікі роду сёння пражываюць у Бабруйску, вёсках Атрошкавічы, Гарбацэвічы і Грабава Бабруйскага раёну, сяле Раждзествена Самарскай вобласці Расіі. У рэлігійным плане усе вядомыя прадстаўнікі роду ў XIX-XX стст. вызнавалі праваслаўе. Гацукі ў выніку шдюбаў парадніліся з родамі Азярцы, Ашуркі, Бародзічы, Галавачы, Гаўрылёнкі, Дразды, Елісеевы, Лейкі, Луцы, Палашаўцы, Пуцікі (Пуцікавы), Росьлікі, Цьвірко.

### 3.2. Радавод

## I пакаленне

**Сымон Гацук** (каля 1815-да 1905), 2-я (?) ж. – Хрысціна (1845-7 (9) лістапада 1905)

## II пакаленне

*Дзеці Сымона Гацука*

1. **Параскевія Гацук** (1842-?), м. - 7 кастрычніка 1862, Гарбацэвічы - Ігнат Якімавіч Палашавец (1840-?) з Рагаляў
2. **Іван Гацук** (1847-9 (10) красавіка 1893), ж. - 4 студзеня 1865, Гарбацэвічы - Зяновія Якаўлеўна Галавач (1847-) з Пабокавічаў
3. **Міна Гацук** (1852-18 (19) сьнежня 1895), ж. – Юстынія Паўлаўна
4. **Марыя Гацук** (1857-19 (21) студзеня 1859). Памерла ад крупу.

## III пакаленне

*Дзеці Івана і Зяновіі з Галавачоў Гацукоў*

2.1. **Аляксей Гацук** (1865, Атрошкавічы-?), ж. – 1) 2 лютага 1892, Гарбацэвічы - Палагея Пятроўна Ашурка (1871-10 (12) лістапада 1894) з Атрошкавічаў; 2) 9 ліпеня 1895, Паўлавічы – Макрына Данілаўна Пуцік (1871-?) з Хімоў

2.2 **Хведар Гацук** (23 верасьня 1871, Атрошкавічы-?)

2.3. **Захар Гацук** (25 сакавіка 1874, Атрошкавічы-?), ж. – Марыя Сцяпанаўна

2.4. **Міхал Гацук** (1877, Атрошкавічы-?), ж. – 1) 31 студзеня 1899, Гарбацэвічы - Васа Парфёнаўна Лейка (1880/1882-6 (8) красавіка 1906) з Атрошкавічаў; 2) 24 траўня 1906, Гарбацэвічы - Еўфрасіння Кліментаўна Луц (1880-?) з Атрошкавічаў

2.5. **Тацяна Гацук** (1882, Атрошкавічаў-?), м. – 29 чэрвеня 1903, Гарбацэвічы - Іван Іванавіч Азярэц (1883-) з Багушоўкі

2.6. **Еўдакім Гацук** (1885, Атрошкавічы – 28 (30) траўня 1886, Атрошкавічы)

2.7. **Максім Гацук** (1887, Атрошкавічы-14 (15) кастрычніка 1893, Атрошкавічы)

*Дзеці Міны і Юстыніі Гацукоў*

3.1. **Аляксандра Гацук** (2 (7) студзеня 1875-?), м. – 19 траўня 1893, Гарбацэвічы - Піліп Пятровіч Бародзіч (1874-) з Мачулак

3.2. **Антон Гацук** (1876, Атрошкавічы-11 (13) сакавіка 1902, Атрошкавічы), ж. – Лізавета Іванаўна (Ігнатаўна; 1879-?) (другі муж – 7 ліпеня 1902, Гарбацэвічы - Зміцер Якаўлевіч Галоўка (1875-?) з Атрошкавічаў)

3.3. **Кацярына Гацук** (1879, Атрошкавічы-?), м. – 11 траўня 1897, Гарбацэвічы - Павал Сямёнавіч Дрозд (1878-?) з хутару Пастаянка

3.4. **Хадос Гацук**, ж. – Улляна (Устына) Пятроўна

3.5. **Палагея Гацук** (15 (19) красавіка 1883, Атрошкавічы-?), м. – 14 траўня 1901, Гарбацэвічы - Якаў Ананевіч Гаўрылёнак (1880-?) з Атрошкавічаў

3.6. **Агапа Гацук** (20 (27) лютага 1886, Атрошкавічы-?), м. – 8 траўня 1905, Гарбацэвічы - удавец Андрэй Рыгоравіч Рослік (1870-), старшы унтэр-афіцэр

3.7. **Андрэй Гацук** (1888, Атрошкавічы – 19 (21) красавіка 1890, Атрошкавічы)

3.8. **Гарасім Гацук** (2 (7) сакавіка 1893, Атрошкавічы-?), ж. – 22 студзеня 1912, Гарбацэвічы - Лізавета Міхалаўна Цвірко (1890-?) са Старцаў

• **Гарпіна** (22 (29) чэрвеня 1897, Атрошкавічы-?)

## IV пакаленне

*Дзеці Аляксея і Палагеі з Аушркаў Гацукоў*

2.1.1. **Мірон Гацук** (11 (17) жніўня, Атрошкавічы – 13 (14) верасьня 1893, Атрошкавічы)

*Дзеці Аляксея і Макрыны з Пуцікаў Гацукоў*

2.1.2. **Пятро Гацук** (29 чэрвеня 1896, Атрошкавічы-?)

2.1.3. **Іван Гацук** (1900, Атрошкавічы-зіма 1943, Круглоніва). Удзельнік савецка-польскай вайны 1918-1920 гадоў. Затым адзін з заснавальнікаў, а пасля брыгадзір саўгасу ў Гарбацэвічах. Займаўся садаводзтвам. У лістападзе 1941 кіраваў пахаваннем ля Гарбацэвічаў 70-і расстраляных савецкіх жаўнераў. Далучыўся да партызанскага аддзелу імя Фурманава (Чапаева), быў кулямётчыкам і выведчыкам дыверсійна-выведнай групы. Лейтэнант. Загінуў у баі з немцамі ля вёскі Круглоніва. 12 лютага 1943 пахаваны ля вёскі Зелянковічы (Глускі раён). Ж. – Еўфрасіння Ўллянаўна[53]

2.1.4. **Вольга Гацук** (3 (6) кастрычніка 1902, Атрошкавічы-?)

2.1.5. **Рыгор Гацук** (1 (4) лютага 1906, Атрошкавічы-?)

2.1.6. **Палагея Гацук** (7 (9) кастрычніка 1907, Атрошкавічы-?)

*Дзеці Захара і Марыі Гацукоў*

2.3.1. **Мікалай Гацук** (3 (26) сакавіка 1912, Атрошкавічы-?), у 1940-я партызан аддзелу імя Фурманава (Чапаева).

*Дзеці Міхала і Васы з Лейкаў Гацукоў*

2.4.1. **Ціт Гацук** (19 (25) жніўня 1902, Атрошкавічы-?)

*Дзеці Міхала і Еўфрасінні (Яўхім'і) з Луцаў Гацукоў*

2.4.2. **Алена Гацук** (5 (10) чэрвеня 1907, Атрошкавічы-?)

2.4.3. **Ціхан Гацук** (17 (23) чэрвеня 1909, Атрошкавічы-?)

---

[53] Казак А. Последние выстрелы отца // Бабруйскае жыццё, № 17180 - 21 красавіка 2010

2.4.4. **Алена Гацук** (12 (13) лістапада 1910, Атрошкавічы-?)

2.4.5. **Аляксей Гацук** (1922-11 сакавіка 1945, Малькаў, Нямеччына). Мабілізаваны, верагодна, улетку 1944 годзе. Служыў у 220-м асобнай выведроце 108 Бабруйскай стралковай дывізіі. Пасля Бабруйскай аперацыі 108 СД увайшла ў склад 46 стралковага корпуса 65-й Арміі, якой камандаваў генерал-палкоўнік Батаў П.І., а корпусам - генерал-лейтэнант Эрастаў К.М. У складзе гэтага корпуса дывізія ваявала да канца вайны. З мяжы Менска часткі дывізіі працягвалі наступ у кірунку Слонім, Пружаны, Шэрдуў, Сямяцічы, 1 жніўня выйшлі да дзяржаўнай мяжы СССР і фарсавалі раку Заходні Буг у раёне Біруў. Надалей дывізія наступала ў кірунку Медзна, Сточак, Вышкуў, у ноч на 6 верасня фарсіравала раку Нараў і да 12 верасня вяла баі па пашырэнні пляцдарму. Да 4 кастрычніка часткі дывізіі вялі інжынерныя працы па стварэнні дужай пазіцыйнай абароны. 4-9 кастрычніка 1944 на сяроцкім пляцдарме адбыўся абарончы бой, які паводле сваёй моцы быў адным з самых жорсткіх для 108 дывізіі за ўсю вайну. На адносна невялікім пляцы (65 Армія займала пляцдарм па фронце 25 км і ў глыбіню ад 8 да 18 км; на ўчастку 108 дывізіі 5х8 км) з абодвух бакоў адначасова біліся 20 стралковых і танкавых дывізій, больш за 1000 танкаў і каля 4000 прылад і мінамётаў. Немцы здолелі пацясніць у першыя дні наступу савецкія часткі, аднак да зыходу 9 кастрычніка, панёсшы велізарныя страты (407 танкаў і больш за 20000 забітымі), змушаныя былі перайсці да абароны, а 19 кастрычніка войскі 65 арміі перайшлі ў наступ, у выніку чаго аднавілі і значна пашырылі пляцдарм, захапіўшы Серацк. За гэтыя баі дывізія была ўзнагароджана ордэнам Леніна. На нараўскім пляцдарме дывізія знаходзілася да студзеня 1945. 14 студзеня пачалася наступальная аперацыя войскаў 2-га Беларускага фронту, у склад якога ўвайшла і 108 СД, па адсячэнні ўсходне-прускай групоўкі ворага з выйсцем да ніжняй плыні Віслы. А 12.00 дня пачалася артылерыйская падрыхтоўка, пасля якой часткі дывізіі на працягу некалькіх гадзін аваладалі лініямі траншэй. Наступ развіваўся імкліва. 18 студзеня часткі дывізіі, пераследваючы адыходзячага суперніка, вызвалілі

горад Плонск, а 23 студзеня бяз бою ўвайшлі ў першы нямецкі горад ва Ўсходняй Прусіі - Бішаўсвэрдэр. Працягваючы наступ 25 студзеня войскі авалодалі горадам Горнзэе, 26 студзеня выйшлі да ракі Вісла на поўдзень ад гораду Марыенвэрдэр. З гэтай мяжы дывізія здзейсніла 50 км марш у раён на поўдзень Граўдэнц, дзе 105 корпус захапіў пляцдарм на заходнім беразе р. Вісла. Пераправіўшыся праз Віслу часткі, дывізіі 8 лютага вялі бой за горад Швец, да зыходу дня 10 лютага цалкам прабілі абарону немцаў і пачалі пераслед у паўночным кірунку. 9 сакавіка часткі дывізіі авалодаді горадам Цукаў за 15 км на захад ад Данцыгу. З прычыны неўкамплектаванасці стралковых палкоў і супраціву немцаў дзённае прасоўванне на Данцыг не перавышала 3 км, і тое дзякуючы у асноўным артылерыі прамой наводкі, танкаў і самоходных усталёвак[54]. Быў забіты 11 сакавіка, Пахаваны на панскім двары ў Малькаў?, цяпер Малкова, гміна Жукова, Картускі павет, Паморскае ваяводства, Польшча[55].

*Дзеці Антона і Лізаветы Гацукоў*

3.2.1. **Хадора Гацук** (12 (13) жніўня 1897, Атрошкавічы-?)

3.2.2. **Аляксандра Гацук** (7 (17) траўня 1899, Атрошкавічы-?)

3.2.3. **Васіль Гацук** (18 сакавіка (2 красавіка) 1901, Атрошкавічы-?)

*Дзеці Хадоса і Ульляны Гацукоў*

3.4.1. **Піліп Гацук** (сьнежань 1900, Атрошкавічы-24 (25) лютага 1901, Атрошкавічы)

3.4.2. **Платон Гацук** (лістапад-7 (8) снежня 1901, Атрошкавічы)

3.4.3. **Ганна Гацук** (7 (15) снежня 1902, Атрошкавічы-?)

3.4.4. **Міхал Гацук** (9 (11) лістапада 1906, Атрошкавічы-?)

3.4.5. **Лука Гацук** (3 (7)-14 (15) студзеня 1909, Атрошкавічы)

3.4.6. **Палагея Гацук** (14 (20) лютага 1910, Атрошкавічы-?)

---

[54] div108.narod.ru/war_road/war_road.html Боевой путь 108-Бобруйской ордена Ленина краснознаменной дивизии

[55] Гацук Алексей Михайлович // obd-memorial.ru

3.4.7. **Ціт Гацук** (28 сакавіка (1 красавіка) 1912, Атрошкавічы), партызан (?) аддзелу імя Фурманава (Чапаева)[56].

*Дзеці Гарасіма і Лізаветы з Цвіркоў Гацукоў*

3.8.1. **Надзея Гацук** (2 (10) лістапада 1912, Атрошкавічы-?)

3.8.2. **Мікалай Гацук** (1916, Атрошкавічы-?). У 1940 годзе ўдзельнік Савецка-фінскай вайны. У чэрвені 1941 году паўторна мабілізаваны ў Чырвоную армію. Старшына, камандзір аддзялення кабельна-шоставай роты 2-га асобнага палку сувязі 2-й Паветранай Арміі. *“У перыяд правядзення аперацыі пад г.Варонежам напрыканцы траўня і напачатку чэрвеня месяца 1942 г. ува ўмовых бесперапынных бамбаванняў р-на знаходжання вузлу сувязі тав. Гацук з групай ваяроў раней за тэрмін навёў 6 шлейфаў на вузел сувязі і забяспечыў устойлівасць іх працы. У г.Ялец на заданне камандавання было загадана старшыне Гацук пабудаваць сталую лінію ў 6 правадоў на адлегласці 5 клм., на працягу 3 дзён. Каманда старшыні Гацук без адпачынку напрацягу двух сутак выканала гэты загад, скончыўшы працу раней за тэрмін на адны суткі. Гэтым самым дала магчымасць хутка перанесці вузел сувязі на новае месца і вывезці з-пад удару варожай авіяцыі. Пры арганізацыі вузлу сувязі 2-й ВА ў м.Чамлык каманда старшыні Гацук напрацягу двух сутак навяла 160 клм. тэлеграфных шлейфаў па слупох, выканаўшы заданьне раней за тэрмін на двое сутак. Якасьць працы шлейфаў была выдатная. Пры правядзеньні наступальных апэрацыяў шостае арміі ў сьнежні месяцы 1942 г. у раёне Верхняя Гнілуша тав. Гацук з трыма ваярамі ў надзвычай сьціснутыя тэрміны па гурбах уручную навёў 40 клм. палявых лініяў. Лініі працавалі ўстойліва, кіраванне авіяцыяй і выклік яе на поле бою быў здзейснены своечасова. Старшыня Гацук сваім асабістым прыкладам заўжды цягне ваяроў на хуткае выкананне баявых заданняў. Адданы справе партыі ЛЕНІНА-СТАЛІНА і Сацыялістычнай Радзіме. Годны высокай*

[5656] Казак А. Последние выстрелы отца // Бабруйскае жыццё, № 17180 - 21 красавіка 2010

*урадавай узнагароды ордэна “ЧЫРВОНАЙ ЗОРКІ”.* 31 сьнежня 1942 узнагароджаны “Медалём Адвагі”[57].

## V пакаленне

*Дзеці Івана і Ефрасінні*

2.1.3.1. **Валянціна Гацук**

2.1.3.2. **Мікалай Гацук**, у 1940-я партызан у аддзеле імя Чапаева (Фурманава)[58].

2.1.3.3. **Рыгор Гацук**, у 1942 па справе бацькі арыштоўваўся і дапытваўся гестапо, пасля ў партызанскім аддзеле імя Чапаева (Фурманава)[59].

2.1.3.4. **Лідыя Гацук,** 20 сакавіка 1944 году ўзятая ў палон немцамі, утрымліваліся 10 дзён у вёсцы Ляскі, пасля ў Бабруйскай фартэцыі. Вывезеныя на працу ў Дрэздэн, працавалі ў вёсцы Хемніц. Вызваленая ўвесну 1945. Пражывае ў сяле Раждзествена Самарскай вобласці Расіі. М. – Елісееў[60].

2.1.3.5. **Ганна Гацук**

## Іншыя асобы

**Гаўрыла Навумавіч Гацук** (?, Зацішша, Слабодкаўскі сельсавет - 1941?), лейтэнант інжэнерных войскаў. Знік без вестак[61].

---

[57] Гацук Николай Герасимович // podvig-naroda.ru
[58] Казак А. Последние выстрелы отца // Бабруйскае жыццё, № 17180 - 21 красавіка 2010
[59] тамсама
[60] тамсама
[61] Воины-уроженцы Бобруйского района, погибшие в годы ВОВ

### 3.3. Атрошкавічы

Вёска Атрошкавічы знаходзіцца ў Гарбацэвіцкім сельсавеце Бабруйскага раёну за 15 кіламетраў на захад ад Бабруйску ля аўтадарогі Бабруйск-Слуцк і Бабруйск-Глуск.

Назва вёскі ўтварылася ад імя Атрошка (Трафім?) ці ад вытворнага ад яго прозьвішча Атрашковіч. У 1838 годзе ў вёсцы жыло 49 рэвізскіх душ. Сама яны знаходзілася ў Бабруйскім павеце Менскай губерні, належала памешчыку.

У 1897 годзе у Атрошкавічах, якія належылі да Гарбацэвіцкай воласці, ужо было 159 жыхароў і 21 двор, працавала хлебазапасная крама. Да 1907 году колькасць двароў узрасла да 28, жыхароў – да 217 жыхароў, у 1917 іх было адпаведна 47 і 300, у 1926 - 63 і 344. У 1929 г ў вёсцы быў арганізаваны калгас імя Якаўлева.

Падчас Другой сусветнай вайны на фронце загінулі 20 вяскоўцаў. Паводле перапісу 1959 году ў Атрошкавічах жыло 172 чалавекі, у 1970 - 143. У 1986 годзе ў вёсцы налічвалася 41 гаспадарка і 102 жыхары. Сама яна знаходзілася ў складзе саўгаса «Бабруйскі». Па стане на 2007 год, у вёсцы было 18 гаспадарак і 26 жыхароў.

Тып забудовы вёскі – цэнтральнабеларускі: адна плаўна выгнутая вуліца з завулкам, арыентаваная з паўднёвага захаду на паўночны ўсход. З двух бакоў вуліца забудаваная драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. Каля вёскі пачынаецца рака Ваўчанка, што ўпадае ў Бярэзіну[62].

[62] Атрошкавічы // Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т.5. кн.1. Магілёўская вобласць / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 2008. — С. 154.

## Высновы

Такім чынам, у дадзенай працы была зробленая спроба даследвання гісторыі родаў Гацак і Гацук, якія ў XIX-XX стст. Былі прааналізаваныя шматлікія крыніцы, літаратура, як генеалагічнага, так і гістарычнага характару. Праца змяшчае спробы этымалогіі прозвішчаў, стварэння радаводных роспісаў, прасочвання гісторыі як родаў у цэлым, так і асобных прадстаўнікоў гэтых семя'ў. Былі выказаныя меркаванні аб магчымым сваяцтве паміж родамі, змешчаныя дадзеныя аб вёсках - родавых гнёздах і г.д.

Між тымі невывучаным застаецца яшчэ вялікі пласт крыніцаў, якія б маглі праліць святло на гісторыю родаў. Да гэтых крыніцаў адносяцца мэтрычныя кнігі, ранейшыя за 1855 год, рэвізскія казкі, выкупныя справы і іншае. Да таго ж неапытаныя яшчэ прадстаўнікі бакавых лініяў роду Гацак, прадстаўнікі родаў Гацук і зробленым.

Так што, на дадзены момант праца ўяўляе сабой толькі першыя спробы генеалагічнага даследвання. Між тым ужо была праведзеная значная праца па вывучэнні родаў і вылучаныя напрмакі далейшага даследвання.

**Крыніцы і літаратура**

1. 102-я стрелковая дивизия (3-го формирования) http://ru.wikipedia.org/wiki/102-%D1%8F_%D1%81%D1%82%D1%80%D0%B5%D0%BB%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D1%8F_%D0%B4%D0%B8%D0%B2%D0%B8%D0%B7%D0%B8%D1%8F_(3-D0%B3%D0%BE_%D1%84%D0%BE%D1%80%D0%BC%D0%B8%D1%80%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D0%B8%D1%8F)
2. 8-я стрелковая дивизия (1-го формирования) http://ru.wikipedia.org/wiki/8-%D1%8F_%D1%81%D1%82%D1%80%D0%B5%D0%BB%D0%BA%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D1%8F_%D0%B4%D0%B8%D0%B2%D0%B8%D0%B7%D0%B8%D1%8F_(1-%D0%B3%D0%BE_%D1%84%D0%BE%D1%80%D0%BC%D0%B8%D1%80%D0%BE%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D0%B8%D1%8F)
3. Адыги - основатели Запорожского казачества? // http://adyga.org/index.php?s=8e6c407fc153d65d196d55085767de39&showtopic=873&pid=20806&st=0&#entry20806
4. Архивная справка по материалам архивного уголовного дела № П-84276 в отношении Гоцак (Гацак) Михаила Николаевича // Управление ФСБ России по Хабаровскому краю
5. Асабістыя дакументы прадстаўнікоў роду
6. База дадзеных сайту obd-memorial.ru
7. База дадзеных сайту podvig-naroda.ru
8. База данных всероссийского генеалогического древа http://baza.vgd.ru/1/9594/
9. Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т.5. кн.1. Магілёўская вобласць / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 2008.
10. Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т.6. кн.2. Магілёўская вобласць / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 2009.

11. Гацак М. Партызанскі радавод // Бабруйскае жыццё, № 17207 - 23 ліпеня 2010
12. Жертвы политического террора в СССР // http://lists.memo.ru/
13. Инвентарь Бобруйскага староства // Акты, издаваемые Виленскою коммиссіею для разбора древнихъ актовъ. Том XXV. Инветари и разграничительные акты. – Вильна, 1898.
14. Инветарь фольварка Рыни, Р□чицкаго пов□та, и его волости, Іосифа Прушановскаго. № 66 – 1778 г. Апр□ля 23. // Акты, издаваемые Виленскою коммиссіею для разбора древнихъ актовъ. Том XXV. Инветари староствъ, им□ній, фольварковъ и деревень за вторую половину XVIII в□ка (1751-1789). – Вильна, 1910.
15. Казак А. Последние выстрелы отца // Бабруйскае жыццё, № 17180 - 21 красавіка 2010
16. Кривошея В.В., Кривошея І.І., Кривошея О.В. Неурядова старшина Гетьманщини. – Київ: "Стилос", 2009.
17. Метрычныя кнігі Гарбацэвіцкай праваслаўнай царквы // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: фонд 136, вопіс 18 (справы 18, 31, 41), 19 (справы 22, 26), 20 (справы 11, 15), 21 (справа 3), 31 (справы 2, 28, 30, 40, 45, 48, 57, 64, 79, 82, 97), 52 (справа 45)
18. Метрычныя кнігі Дваранінавіцкай праваслаўнай царквы // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: фонд 136, вопіс 18 (справы 16, 32, 33, 41, 46, 51, 58), 19 (справы 6, 11)
19. Метрычныя кнігі Міхалёўскай праваслаўнай царквы // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: фонд 136, вопіс 15 (справы 4, 6, 14, 24), 16 (справы 4, 8, 12, 16), 20 (справы 3, 28, 33), 31 (справы 28, 37, 47, 49, 63, 78, 96, 106, 115, 122), 52 (справы 64, 66, 67)
20. Метрычныя кнігі Паўлавіцкай праваслаўнай царквы // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі: фонд 136, вопіс 20 (справа 30)
21. Могілкі ў вёсках Барак, Ганчароўка, Лейчыцы Бабруйскага раёну

22. В.К. Лукомскій, В.Л. Модзалевскій, Г.И. Нарбутъ. Малороссійскій гербовникъ. Репринт издания 1914 г., - 1993.
23. Памяць. Бабруйск. – Мн., Вышэйшая школа, 1995
24. Памяць. Бабруйскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Гал. рэд. Г. П. Пашкоў. — Мн., 1998.
25. Польский поход РККА http://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%9F%D0%BE%D0%BB%D1%8C%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B9_%D0%BF%D0%BE%D1%85%D0%BE%D0%B4_%D0%A0%D0%9A%D0%9A%D0%90_(1939)
26. Реестр Войска Запорожского 1649 года // http://forum.vgd.ru/299/25273/0.htm?a=stdforum_view&o=
27. Сведения по воинским частям, участвовавшим в сражениях Советско-финляндской войны 1939-1940 гг.
28. Уладзімір Юрэвіч. Беларускія прозвішчы. http://knihi.com/jurevic_u/prozviscy.html
29. Успаміны Уладзіміра Мяфодзевіча Гацака, Ларысы Мяфодзеўны Манько, Валянціны Мяфодзеўны Нікалаенкі, Віктара Уладзіміравіча Гацака, Максіма Віктаравіча Гацака